**Здановіч У.В.**

# БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: АСАБЛІВАСЦІ СУЧАСНАГА ПЕРЫЯДУ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Падзеі Вялікай Айчыннайвайны сталі гісторыяй. Пра яе напісаны дзясяткі тысяч розных работ: даследчых, мемуарных, публіцыстычных, мастацкіх. У айчыннай гістарыяграфіі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны выдзеляюцца савецкі (1941 – канец 1991 г.) і сучасны, ці постсавецкі перыяды (з канца 1991 г. па сённяшні дзень). Пасля набыцця Рэспублікай Беларусь статуса незалежнай і суверэннай дзяржавы значна пашырылася і стала больш рэпрэзентатыўнай крыніцазнаўчая база навуковых даследаванняў. Гісторыкі пачалі выкарыстоўваць дакументы і матэрыялы архіваў замежных краін, у першую чаргу, Германіі і Польшчы.

Па найбольш вострых пытаннях мінулай вайны, да якіх несумненна адносіццапачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны, разгарнулася палеміка. Канцэптуальнай асновай гістарыяграфіі савецкага перыяду былі тэзісы аб арганізаваным характары мабілізацыйных мерапрыемстваў, праведзеных партыйнымі органамі ў выключна складаных умовах ваеннай абстаноўкі, аб нечаканасці вайны для Савецкага Саюза і значнай перавазе вермахта над Чырвонай Арміяй у жывой сіле і тэхніцы.Новыя факты, дакументы, уведзеныя ў навуковы ўжытак у постсавецкі перыяд, сведчаць аб тым, што ў стратэгічным плане савецкае кіраўніцтва рыхтавалася да вайны з Германіяй. Аднак допушчаныя партыйнымі і дзяржаўнымі органамі і асабіста І.В. Сталіным пралікі прывялі да таго, што вайна стала нечаканасцю для савецкіх войск у ваенна-тактычным сэнсе. На пачатковым этапе не існавала тэхнічнай перавагі вермахта над войскамі Чырвонай Арміі. Па колькасці танкаў, самалётаў, гармат Савецкі Саюз пераўзыходзіў Германію, навукова-тэхнічны ўзровень савецкай тэхнікі не толькі адпавядаў лепшым сусветным стандартам, але і па некаторых напрамках апераджаў іх. Аднак савецкае кіраўніцтва неэфектыўна выкарыстала свае баявыя сілы, што стала прычынай адступлення войск Заходняга фронту ўглыб тэрыторыі СССР. Разам з тым група армій “Цэнтр” панесла значныя страты, былі запаволены тэмпы яе наступлення, што дало магчымасць савецкаму камандаванню перагрупаваць сілы Чырвонай Арміі і ў далейшым затрымаць нямецкія войскі. Новыя падыходы ў асвятленні падзей 1941 г. на тэрыторыі Беларусі замацаваны ў працах Р.П. Платонава І.А. Басюка, А.А. Кавалені, С.Я. Новікава, А.М. Літвіна, калектыўным выданні “Беларусь в годы Великой Отечественной войны” [2].

Характэрнай асаблівасцю новага перыяду беларускай гістарыяграфіі стала з’яўленне побач з традыцыйнымі тэмамі новых накірункаў даследаванняў, якія ў савецкія часы па розных прычынах, у першую чаргу ідэалагічных, заставаліся па-за сферай інтарэсаў даследчыкаў. Асаблівая ўвага надавалася вывучэнню дзейнасці Арміі Краёвай, украінскаму нацыяналістычнаму падполлю і найперш арганізацыям АУН-УПА, праблемам калабарацыі.

У савецкі час тэрмін “калабарацыя” ўжываўся пераважна для характарыстыкі з’явы ў заходнееўрапейскіх краінах. Што да асвятлення рэаліяў германскай акупацыі тэрыторыі СССР, то часта без вызначэння абставін і матываў усе тыя, хто супрацоўнічаў з акупантамі, былі залічаны ў разрад саўдзельнікаў у злачынствах і здраднікаў. У 1990-я гг. з’явіліся працы айчынных навукоўцаў, якія адлюстроўвалі новыя накірункі ў вывучэнні акрэсленай тэмы. У гістарыяграфічны ўжытак былі ўведзены паняцці “калабарацыянізм”, “калабарацыя”. Гісторыкі адышлі ад агульна-абвінаваўчага ўхілу ў вывучэнні пытанняў супрацоўніцтва з германскімі ўладамі, паспрабавалі разабрацца ў пабуджальных матывах калабарацыі. Разнастайныя аспекты гэтай праблемы даследаваліся А.М. Літвіным, А.А. Каваленем, А.К. Салаўёвым, У.І. Кузьменкам, І.Ю. Сервачынскім, Я.А. Грэбенем, А.В. Бяляевым, С.У. Жумарам і інш [3].

Аналіз прыведзеных у даследаваннях фактаў дае магчымасць зрабіць выснову: сацыяльна-палітычнае жыццё ў СССР напярэдадні вайны, паражэнні Чырвонай Арміі ў пачатку вайны, імклівы захоп вермахтам тэрыторыі Беларусі, жорсткі акупацыйны рэжым, актыўная ідэалагічна-прапагандысцкая апрацоўка насельніцтва германскімі ўладамі садзейнічалі ідэалагічнаму размежаванню ў грамадстве, у тым ліку і маладзёжным асяроддзі. Усё гэта стала спрыяльнай псіхалагічнай падставай для стварэння прагерманскіх маладзёжных саюзаў і дазволіла нацысцкім прапагандыстам уцягнуць у сферу сваіх палітычных, эканамічных і ваен-

Репозиторий ВГУ

ных інтарэсаў некаторую частку беларускай моладз. Аўтары выдзяляюць палітычную, эканамічную і ваенную калабарацыю. На практыцы калабарацыя ўяўляла сабой свядомае ідэйнае супрацоўніцтва (палітычныя і грамадскія аб'яднанні, арганізацыі і г.д.), супрацоўніцтва з карыслівага матэрыяльнага разліку (служба ў разнастайных органах) і прымусовае супрацоўніцтва (праца ў адміністрацыйна-гаспадарчых органах і на прадпрыемствах). Заслугоўвае ўвагі характарыстыка, дадзеная калабарантам У.І. Кузьменкам, пра тое, што сёння цяжка разабрацца, што было галоўным у кіраўнікоў калабаранцкіх арганізацый і структур: сапраўдны нацыянальны ідэалізм ці падкантрольнасць нямецкім спецслужбам, "замбіраванасць" імі. Несумненна, што побач з "узнёслымі ідэалістамі" сярод калабарантаў былі палітыканы і авантурысты, якія шукалі любой улады і поспеху, гатовых "дзеля гэтага служыць каму заўгодна" [8, с. 137]. Няма падстаў для паказу лідэраў палітычнай беларускай калабарацыі нацыянальнымі героямі, якія змагаліся супраць сталінізму за незалежную беларускую дзяржаву.У мэты нацысцкага кіраўніцтва Германіі не ўваходзіла захаванне незалежнай Беларусі. Наадварот, у часы акупацыі беларускі народ страціў не толькі дзяржаўную, але і тэрытарыяльную цэласнасць, і толькі барацьба насельніцтва супраць акупантаў пры велізарных людскіх стратах дазволіла захаваць Беларусь. Знаходзячыся на службе ў прагерманскіх арганізацыях і ваенных фарміраваннях, прадстаўнікі беларускай калабарацыі прымалі ўдзел у разнастайных мерапрыемствах акупантаў, у тым ліку ў карных экспедыцыях, барацьбе з партызанамі, знішчэнні савецкага актыву і прыхільнікаў СССР і Чырвонай Арміі. Разам з тым, нельга аднолькава ацэньваць вымушанае супрацоўніцтва насельніцтва з германскімі ўладамі і тыя выпадкі, калі калабаранты свядома прымалі ўдзел у злачынствах і тэроры.

У асвятленні гісторыі Арміі Краёвай аўтар дадзенага артыкула з'яўляецца прыхільнікам прынцыпу двухбаковасці, які падтрымліваюцьА.М. Літвін, В.І. Ермаловіч, С.В. Жумар, А.В. Касовіч, І.І. Коўкель, І.П. Крэнь, І.А. Валахановіч [5]. З аднаго боку, савецкія партызаны і фарміраванні АК, маючы аднаго ворага, аб'ектыўна знаходзіліся па адзін бок барыкады, што садзейнічала развіццю паміж імі нармальных добрасуседскіх стасункаў. З другога боку, палітычныя адносіны савецкага кіраўніцтва і лонданскага польскага ўрада, найперш, яго прэтэнзіі на землі Заходняй Беларусі, рабілі немагчымым доўгатэрміновае супрацоўніцтва і прыводзілі да непазбежнага канфлікту паміж акаўцамі і савецкімі партызанамі. Абвастрэнню адносінаў садзейнічалі факты супрацоўніцтва асобных атрадаў АК з акупацыйнымі ўладамі і вермахтам. Адмежаванне Лонданскага ўраду і кіраўніцтва АК у Варшаве ад такой тактыкі істотна на сітуацыю не ўплывалі, якая, як справядліва адзначае А.М. Літвін, паступова перарастала ў жорсткую грамадзянскую вайну [9, с. 125].

Адначасова дзейнасць Арміі Краёвай мела выразны антыбеларускі характар, аб чым сведчаць дакументальныя матэрыялы, выяўленыя намі ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Так, у дырэктыве кіруючага цэнтра партыі "Грэнадзёраў" ад 14.05.1943 г., падпісанай капітанам Ф. Дубінскім, у прыватнасці, адзначалася: "Немец і беларус – ворагі польскага народа. Зжывайцеся з партызанамі, заваёўвайце ў іх аўтарытэт, а пры зручным выпадку – забівайце іх" [10, арк. 325]. Праграмныя дакументы знаходзілі рэальнае ўвасабленне: 24 лістапада 1943 г. па загадзе камандзіра польскага коннага атрада Нуркевіча ("Ноч") каля в. Дубнякі Івянецкага раёна Баранавіцкай вобласці былі растраляны 11 савецкіх партызан. Факт растрэла пацвердзілі афіцэры польскага атрада Мілашэўскага – Ю. Бабравіцкі, М. Ржавускі, С. Гаворка, В. Пелка [10, арк. 218, 228, 229, 249, 290, 331].

У 1990-я гг. у рэспубліцы з'явіліся публікацыі па гісторыі ўкраінскіх, літоўскіх, польскіх падпольных фарміраванняў. Асаблівая ўвага надавалася ўкраінскаму нацыяналістычнаму падполлю і найперш арганізацыям АУН-УПА. У значнай ступені інтарэсы даследчыкаў стымулявалі дыскусіі пра значэнне ролі названых структур у гісторыі Украіны. Частка ўкраінскага грамадства выступіла за прызнанне членаў АУН-УПА ветэранамі Другой сусветнай вайны. Адначасова ў рэспубліцы пачаў актыўна культывавацца вобраз удзельнікаў нацыяналістычнага падполля як актыўных барацьбітоў супраць савецкага таталітарызму. Розныя погляды на дзейнасць АУН-УПА ў гады вайны знайшлі адлюстраванне на старонках выданняў.

Ацэньваючы дзейнасць АУН-УПА на тэрыторыі Беларусі, адзначым што да лета 1943 г. аўнаўцы не вялі актыўных баявых дзеянняў супраць савецкіх партызан, а ў адносінах да акупацыйных войск займалі тактыку пасіўнай абароны: на тэрор адказвалі тэрорам, не дапускалі вы-

вазу насельніцтва і маёмасці ў Германію. Змяшчэнне акцэнтаў у дзейнасці АУН адбылося пасля прыняцця ў жніўні 1943 г. новай праграмы арганізацыі. Змянілася і тактыка ўкраінскіх нацыяналістычных фарміраванняў, якія ад супрацоўніцтва з савецкімі партызанскімі атрадамі і брыгадамі перайшлі да барацьбы з імі пад маркай таго, што яны актыўнымі дзеяннямі супраць акупантаў наклікаюць небывалы тэрор на насельніцтва. Адносна германскіх войск працягвала заставацца тактыка пасіўнай абароны. Дадзеная выснова знаходзіць пацвярджэнне ў кандыдацкіх дысертацыях Ю.В. Чарняка, С.А. Сільвановіча, Н.А. Рыбак, І.А. Валахановіча, артыкулах У.І. Гуленкі [6].

Характэрнай рысай сучаснай гістарыяграфічнай сітуацыі выступае з'яўленне разам з афіцыйнымі ацэнкамі альтэрнатыўных падыходаў, аўтарамі якіх часцяком выступаюць непрафесійныя гісторыкі. Некаторыя палажэнні, вывады і ацэнкі савецкай гістарыяграфіі змяніліся на супрацьлеглыя. Разам з навукова абгрунтаванымі сустракаюцца спрэчныя, непераканаўчыя, нават амбіцыйныя заключэнні, якія не пацвярджаюцца гістарычнымі фактамі і аргументамі. У асобных выданнях дэкларатыўна, без аргументацыі тэрмін “Вялікая Айчынная вайна” быў заменены паняццем “Нямецка-савецкая вайна” (З. Шыбека) [15, с. 310]. Адзначым, што дадзеная выснова не з’яўляецца новай і базіруецца на тэзісах замежнай гістарыяграфіі, паводле якіх Вялікая Айчынная вайна з’яўляецца часткай Другой сусветнай вайны. Не аспрэчваючы дадзенага сцвярджэння, падкрэслім, што Вялікая Айчынная вайна вырашальная частка, якая вырашыла зыход усёй Другой сусветнай вайны.Тэрмін “Вялікая Айчынная вайна” паказвае, што ў барацьбе супраць захопнікаў удзельнічалі прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей і народнасцей, катэгорый, слаёў насельніцтва, якія пражывалі на тэрыторыі СССР і абаранялі сваю Айчыну. Упершыню гэта словазлучэнне ў звыклым нам выглядзе было выкарыстана ў адносінах да дадзенай вайне ў артыкулах газеты «Праўда» ад 23 і 24 чэрвень 1941 г. і спачатку ўспрымалася не як тэрмін, а як адно з газетных клішэ, нароўні з іншымі падобнымі словазлучэннямі : “святая народная вайна” , “свяшчэнная айчынная народная вайна”, “пераможная айчынная вайна”. Тэрмін “Айчынная вайна” быў замацаваны увядзеннем ваеннага Ордэна Айчыннай вайны Указама Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 20 мая 1942 г.

У расійскай гістарыяграфіі ў пачатку 1990-х разгарнулася дыскусія па праблеме пярэдадня вайны і яе пачатку,краевугольным каменем якой сталавыснова В. Суворава аб тым, што І.В. Сталін, з’яўляючыся прадаўжальнікам справы К. Маркса і У. Леніна, з мэтай экспарту сацыялістычнай рэвалюцыі развязаў Другую сусветную вайну. Дзеля дасягнення пастаўленай мэты ён падтрымаў нацыстаў і садзейнічаў прыходу А. Гітлера да ўлады, дапамог Германіі ўзброіцца і з дапамогай пакта аб ненападзе ад 23 жніўня 1939 г. садзейнічаў пачатку вайны. Пры гэтым І.В. Сталін сам рыхтаваўся да нападу на Германію ў 1941 г. [13].

Не падтрымліваючы тэзіса В. Суворава аб адказнасці Савецкага Саюза ў развязванні вайны, адзначым,што ідэіаб прэвентыўным удары Савецкага Саюза распрацоўваліся прадстаўнікамі Генеральнага штаба Чырвонай Арміі, асобнымі тэарэтыкамі. Пацвярджэннем гэтага з’яўляюцца “Соображения по плану стратегического развертывания сил Советского Союза на случай войны с Германией и ее союзниками”, распрацаваныя Генеральным штабам Чырвонай Арміі 15 мая 1941 г. [12]. Аднак, як сведчыць дастаткова інфармаваны сведка і ўдзельнік тых падзей П.А. Судаплатаў, плана прэвентыўнай вайны з Германіяй не існавала. Г.М. Жукаў і А.М. Васілеўскі прапаноўвалі апярэдзіць немцаў у стратэгічным разгортванні войск у выпадку, калі Германія пачне ваенныя дзеянні. Але на практыцы і гэтыя прапановы не былі падтрыманы вышэйшым савецкім кіраўніцтвам і таму не былі рэалізаваны. На дадзены момант дакладных дакументальных сведчанняў аб прыняцці такога рашэння не існуе, і таму гаварыць аб рэальнасці дадзенага плана няма падстаў. Да таго ж кіраўніцтва СССР не аддавала загаду войскам пачаць вайну, што магло б лічыцца палітычным рашэннем яе пачатку.

У 1990-я гг. прадметам дыскусііне толькі ў навуковым асяроддзі, але і ў розныхслаяхграмадства стала праблемапартызанскагаруху. Найпершгэтапраявілася ў публіцыстыцы: у газетных і часопісных артыкулах гісторыя партызанскай барацьбы стала аб’ектам крытыкі, якая галоўным чынам канцэнтравалася вакол такіх праблем, як характар партызанскага руху і роля камуністычнай партыі ў ягостанаўленні і развіцці. Паказальнай у гэтым сэнсе з’яўляецца кніга Ю. Туронка “Беларусь пад нямецкай акупацыяй”, у якой аўтар заяўляе, што ўсенародны характар партызанскай барацьбы звязаны з імкненнем улад БССР надаць ёй такі характар [14, с. 99]. “У людской свядомасці, – адзначае Ю. Туронак, – засталіся вельмі глыбокія прынцыповыя



Репозиторий ВГУ

адрозненні паміж Беларуссю Заходняй і Усходняй. Гэта яскрава выявілася ў час акупацыі: паабапал былой мяжы панавалі розныя грамадскія адносіны, розныя настроі і паводзіны насельніцтва, розная ўдзельная вага і ўзаемадачыненні палітычных фактараў і груповак" [14, с. 4].

Высновы, зробленыя польскім даследчыкам, падтрымаў беларускі гісторык В.В. Барабаш, які сцвярджае, што "ў дачыненні рэгіёна Заходняй Беларусі не зусім прыймальнай з'яўляецца распаўсюджаная ў савецкай гістарыяграфіі фармулёўка ўсенароднай барацьбы супраць гітлераўскіх акупантаў. Паколькі ў гэтым рэгіёне існавалі і другія палітычныя рухі, якія мелі асабістыя мэты і ўплыў сярод мясцовага насельніцтва, у тым ліку і польскі рух Супраціўлення. Тут фарміраваўся і асноўны склад беларускіх калабарацыянісцкіх арганізацый" [1, с. 118]. Аналагічныя ацэнкі выказаў З.В. Шыбека: "Мінулая вайна не яднала народ Беларусі, не стала для яго патрыятычным абавязкам. Вайна не набыла характар народнай" [16].

Разнастайныя факты, у тым ліку і архіўныя матэрыялы, даюць права сцвярджаць, што высновы Я. Шыраева, Ю. Туронка, В. Барабаша, З. Шыбекі не адпавядаюць гістарычнай праўдзе. У атрадах і брыгадах налічвалася 374 000 чалавек, а праз партызанскія рэзервы прайшлі амаль 400 000 мясцовых жыхароў. Лічбы, якія прыводзяць беларускія гісторыкі, знаходзяць пацвярджэнне ў сучаснай нямецкай гістарыяграфіі. У прыватнасці, Х. Герлах прыводзіць наступныя дадзеныя па колькасці беларускіх партызан: "У жніўні 1941 г. – 1 200 чалавек, у канцы 1941 г. – 30 000, у пачатку 1942 г. – 23 000, у студзені 1943 г. – 57 700, у чэрвені 1943 г. – 80 700, у верасні 1943 г. – 103 600, у лістападзе 1943 г. – 122 600 (плюс 30 800 за лініяй фронту), у сакавіку 1944 г. – 180 000 чалавек, што складае ўвогуле 374 000 партызан, сярод якіх 283 000 байцоў. Да таго ж у партызанскім рэзерве знаходзілася амаль 400 000 чалавек [11, с. 153]. Зразумела, што актыўны ўдзел у барацьбе магла прыняць толькі частка насельніцтва, якая пражывала на тэрыторыі Беларусі, захопленай германскімі войскамі. Дзеці, людзі старэйшага ўзросту, інваліды, жанчыны ў большасці сваёй не маглі ўдзельнічаць ва ўзброенай барацьбе. Але менавіта на іх падтрымку і дапамогу абапіраліся актыўныя ўдзельнікі барацьбы. Такім чынам, нягледзячы на існаванне пэўнай часткі калабарантаў сярод беларускага насельніцтва, няма падстаў адмаўляцца ад усенароднага характару партызанскага руху.

Разам з тым неабходна адзначыць, што толькі з восені 1943 г. партызанскі рух набыў сапраўды ўсенародны характар. Як паказвае аналіз дакументальных крыніц і апублікаванай літаратуры, у пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны праблематычна гаварыць пра адзінства беларускага народа. Разам з патрыятычным уздымам, які быў характэрны найперш жыхарам усходняй Беларусі, мелі месца і тэндэнцыі ідэйна-палітычнага размежавання грамадства. Гэта было абумоўлена шэрагам аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў: незадавальненне часткі насельніцтва рэпрэсіўнай палітыкай І. Сталіна ў адносінах да жыхароў далучаных у 1939 г. тэрыторыі, супярэчнасці ў палітычным жыцці БССР, знешняя палітыка СССР напярэдадні вайны, паражэнні Чырвонай Арміі, шырокая прапагандысцкая кампанія акупацыйных уладаў па фарміраванні сярод насельніцтва антысавецкіх настрояў.

У некаторых працах знік тэрмін "камуністычная партыя" і быў заменены паняццем "кіруючыя органы". У прыватнасці, В.В. Калюта ў кандыдацкай дысертацыі, прысвечанай дзейнасці падполля на тэрыторыі Беларусі ў першы перыяд Вялікай Айчыннай вайны, адну з задач сваёй навуковай працы фармулюе наступным чынам: "Прааналізаваць дзейнасць цэнтральных і мясцовых кіруючых органаў па арганізацыі на акупіраванай тэрыторыі падпольных цэнтраў і сеткі арганізацый і груп" [7, с. 13]. Узнікае заканамернае пытанне: "А што гэта за кіруючыя органы і цэнтры?" Аналіз працы паказвае, што пад паняццем "кіруючыя органы" даследчык разумее менавіта партыйныя органы. Такая падмена стварае ўяўленне, што ў гады вайны дзяржаўныя інстытуты дзейнічалі самастойна, незалежна ад камуністычнай партыі, што не адпавядае рэальнасці. Ад імя партыі выдаваліся ўсе дакументы па арганізацыі Супраціўлення. На чале кіруючых органаў партызанскага руху (ЦШПР, БШПР), камандзірамі злучэнняў былі сакратары ЦК КП(б)Б і падпольных партыйных абкамаў. Партыйны кантроль не дазволіў партызанскаму руху ператварыцца ў звычайную "партызаншчыну" з усімі яе наступствамі. Поўнае адмаўленне ролі камуністычнай партыі ў станаўленні і развіцці партызанскага руху па сутнасці з'яўляецца такім жа скажэннем гісторыі, як і яе празмернае ўхваленне. Неабходна ўдумлівае, скрупулёзнае навуковае вывучэнне дадзенай праблемы, якое павінна грунтавацца не на ідэалагічных устаноўках, а на канкрэтных гістарычных фактах.



Рэпазіторый ВДУ

Праведзены гістарыяграфічны аналіз прац і апублікаваных крыніц сведчыць пра тое, што ў постсавецкі перыяд вывучэнне гісторыі Беларусі часоў Вялікай Айчыннай вайны паднялося на новы ўзровень. Пашырэнне крыніцазнаўчай базы дало магчымасць даследчыкам па-новаму асэнсаваць разнастайныя праблемы. Асаблівасцю постсавецкай гістарыяграфіі стала засваенне новых накірункаў даследавання, а таксама вывучэнне тых пытанняў, якія ў савецкі час асвятляліся няпоўна і аднабакова(пачатковы перыяд вайны, праблема калабарацыянізму, дзейнасць на тэрыторыі Беларусі Арміі Краёвай і антысавецкага падполля, роля партыі і інш.). Некаторыя палажэнні, вывады і ацэнкі савецкай гістарыяграфіі змяніліся на супрацьлеглыя. Разам з навукова абгрунтаванымі сустракаюцца спрэчныя, непераканаўчыя, нават амбіцыйныя заключэнні, якія не пацвярджаюцца гістарычнымі фактамі і аргументамі. Аднак, нягледзячы на наяўнасць у нашым даследаванні некаторых, зусім нязначных па колькасці, магчыма не ў поўнай меры навукова абгрунтаваных сцвярджэнняў па прычыне аб'ектыўнай адсутнасці дастатковай базы гістарыяграфічных крыніц і гістарычных фактаў, айчынныя даследчыкі ў сваёй абсалютнай большасці выступалі і выступаюць супраць пераглядy гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, яе хода, вынікаў і значэння, асабліва ролі савецкага народа ў разгроме фашызму ў Еўропе.

Літаратура


1. Барабаш, В.В. Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944 гг.) / В.В. Барабаш. – Гродно: ГрГУ, 1998. – 146 с.
2. Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг. / А.А. Коваленя (рук. авт. колл.) [и др.]. – Минск: Белта, 2005. – 544 с.; Басюк, І.А. Пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі: манаграфія / І.А. Басюк. – Гродна: ГрДУ, 2003. – 238 с.; Каваленя, А.А. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны (1939–1945) / А.А. Каваленя. – Мінск: БДПУ, 1996. – 183 с.; Літвін, А.М. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны: да праблемы вывучэння / А.М. Літвін // 1941 год: трагедия, героизм, память: материалы междунар. научн. конф., посвящ. 65-годовщине начала Великой Отечественной войны, Брест, 22–23 июня 2006 г. / Ин-т истории НАН Беларуси [и др.], редкол.: М.Э. Чесновский [и др.]. – Брест, 2007. – С. 43–54.; Новікаў, С.Я. Абарона Брэсцкай крэпасці летам 1941 года ў ацэнцы гістарыяграфіі і ў святле дакументаў / С.Я. Новікаў // Беларус. думка. – 2010. – № 5. – С. 88–97.; Платонов, Р.П. Белоруссия, 1941-й: известное и неизвестное: по док. Нац. арх. Респ. Беларусь / Белорус. НИИ документоведения и арх. дела, Нац. арх. Респ. Беларусь / Р.П. Платонов. – Минск: БелНИИДАД, 2000. – 299 с.
3. Беларусь в годы Великой Отечественной войны: 1941–1945 гг. / А.А. Коваленя (рук. авт. колл.) [и др.]. – Минск: Белта, 2005. – 544 с.
4. Беляев, А.В. Местная вспомогательная администрация в системе немецко-фашистского оккупационного режима в Беларуси (1941–1944 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / А.В. Беляев; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2005. – 16 с.; Гребень, Е.А. Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941–1944 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Е.А. Гребень; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2005. – 16 с.; Жумарь, С.В. Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны / С.В. Жумарь. – Минск: БелНИИДАД, 1996. – 283 с.; Каваленя, А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць / А.А. Каваленя. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1999. – 260 с.; Кузьменко, В.И. В суровые сороковые: интеллигенция Беларуси в Великой Отечественной войне (1941–1945 гг.) / В.И. Кузьменко; науч. ред. А.М. Литвин. – Минск: Ин-т истории НАН Беларуси, 2006. – 260 с.; Літвін, А.М. Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі / А.М. Літвін. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – 288 с.; Сервачинский, И.Ю. Коллаборационизм на оккупированной территории Беларуси (июль 1941 – август 1944 гг.): автореф. дис. …канд. ист. наук: 07.00.02 / И.Ю. Сервачинский; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1999. – 16 с.; Соловьев, А.К. Белорусская Центральная Рада: создание, деятельность, крах / А.К. Соловьев. – Минск: Наука и техника, 1995. – 176 с.
5. Валаханович, И.А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944–1953 гг. / И.А. Валаханович. – Минск: Изд-во БГУ, 2002. – 146 с.; Ермолович, В.И. Огнем и мечом: хроника польского национа-листического подполья в Белоруссии (1939–1953 гг.) / В.И. Ермолович, С.В. Жумарь. – Минск: БелНИЦДААД, 1994. – 112 с.; Касович, А.В. Сопротивление германским оккупантам в западных областях Белоруссии в годы Великой Отечественной войны: 1941–1944 гг.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Белорус. гос. пед. ун-т имени М. Танка; А.В. Косович. – Минск, 2004. – 23 с.; Армія Краёва на тэрыторыі Заходняй Беларусі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.): тэз. IV навук. канф. беларус. і пол. гісторыкаў, Гродна, 6–7 кастр. 1994 г. / Гродн. дзярж. ун-т.; рэдкал.: І.П. Крэнь [і інш.]. – Гродна, 1994. – 140 с.; Літвін, А.М. Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі / А.М. Літвін. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – 288 с.
6. Валаханович, И.А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944–1953 гг. / И.А. Валаханович. – Минск: Изд-во БГУ, 2002. – 146 с.; Гуленка, У.І. І тэрор мае свой колер, альбо пра тое, які след пакінулі бандэраўцы і акаўцы на Беларусі / У.І. Гуленка // Беларусь. – 1993. – № 3. – С. 16–17.; Рыбак, Н.А. Деятельность Армии Крайовой и постаковских формирований в Западной Беларуси в 1944–1945 гг.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Н.А. Рыбак; Белорус. гос. пед. ун-т. – Минск, 2001. – 20 с.; Сільвановіч, С.А. Антысавецкае падполле ў заходніх абласцях Беларусі (верасень 1939–чэрвень 1941 гг.): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / С.А. Сільвановіч; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – 22 с.; Черняк, Ю.В. Деятельность украинских организаций и их вооруженных формирований на территории Западной Беларуси в годы Великой Отечественной войны: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Ю.В. Черняк; Белорус. гос. пед. ун-т. – Минск, 2007. – 20 с.
7. Калюта, В.В. Боевая и политическая деятельность подполья на территории Белоруссии в первый период Великой Отечественной войны (июнь 1941–1942 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В.В. Калюта; Минск. гос. пед. ин-т имени А.М. Горького. – Минск, 1992. – 27 с.
8. Кузьменко, В.И. В суровые сороковые: интеллигенция Беларуси в Великой Отечественной войне (1941–1945 гг.) / В.И. Кузьменко; науч. ред. А.М. Литвин. – Минск: Ин-т истории НАН Беларуси, 2006. – 260 с.
9. Літвін, А.М. Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі / А.М. Літвін. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – 288 с.
10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 1450. – Воп. 2. – Спр. 50. – Арк. 1–330.
11. Новікаў, С.Я. Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны / С.Я. Новікаў; навук. рэд. Э.Р. Іофе. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 284 с.


Репозиторий ВГУ

12. Соображения по плану стратегического разведывания сил Советского Союза на случай войны с Германией и ее союзниками // Военно-исторический журнал. – 1992. – № 2. – С. 17–19.
13. Суворов, В. Ледокол: Кто начал Вторую мировую войну; День: Когда началась Вторая мировая война / В. Суворов. – Москва: ТКО АСТ, 1994. – 576 с.
14. Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Ю. Туронак; пер. з польск. В. Ждановіч, кам. А.М. Літвіна. – Мінск: Беларусь, 1993. – 236 с.
15. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі / З. Шыбека. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.
16. Шыбека, З.В. Малавядомыя бакі нацыянальнай бяды, прынесенай беларусам Другой сусветнай вайной / З.В. Шыбека // Першая і Другая сусветныя войны: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 5 мая 2005 г. / Мінскі міжнар. адукац. Цэнтр, Дортмундскі міжнар. адукац. цэнтр, Саюз беларус. яўрэйскіх грамад. аб'ядн. і абшчын, Гіст. майстэрня ў Мінску; адк. рэд.: В.Ф. Балакіраў, К.І. Козак. – Мінск, 2006. – С. 82–86.

Репозиторий ВГУ